**Валерыя Кустава**

# Каб неба сагрэць...

*Вершы*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2004

*Здранцвеюць вусны*
*буду вачыма*
*гаварыць.*
*Выкажу вочы -*
*буду рукамі*
*глядзець.*
*Прагледжу рукі -*
*буду сэрцам*
*вітацца.*
*Развітаю сэрца -*
*буду душою*
*біцца.*
*Разабю душу -*
*буду...*
*Проста Буду.*

Гэта нечакана, бо даўно чакана. Гэта толькі Валерыяй Куставай выгукнута. Гэта ўражвае. Парушыў закон цытавання. Звычайна цытуецца адно колькі радкоў. Парушыў, бо не ўтрымаўся. Хай чытач даруе. Але запэўніваю чытача: у кнізе Валерыі Кустаў «Каб неба сагрэць...» і яму хопіць здзіўлення. А здзіўленне жывіць і трываліць усё жывое на зямлі.
І неба грэе.

Рыгор Барадулін

## ПРАСТОРА ГРАДУСА

*** * *         (Юны Бог)**

Ты такі наіўны, мой Бог,—
ты падобны крыху на дзіця.
Не маўчы, каб і я не змоўк,
не адмоўся, каб я не змог
адлякацца твайго быцця.
Што Галгофа мне — што Амстэрдам,
Рым, Варшава, Мадрыд, Парыж,
Прага, Вільня...
Расстрыгаў храм!..
*Тут* вакхічнасць гаспод... а там?..
*Там* — размовы бяскроўных дам.
Ды *паўсюль* ты, як грэх, гарыш,
несучы тайнапісны крыж,
бы парушыў святы запавет,-
ты ж ад фальшу схаваў мой свет,
абярог ад мастацтва зла,
аджагнаў ад нямотнага тла,
каб глыбінную зеўру дна
не спазнала мая галізна.

Ты такі недарэчны, мой Бог,
выпадковы такі ж, як я.
Што ж — ты ўзвысіў *цяпер* над *пасля,*
ды згубіў свой відушчы зрок.
Местачковы менскі прарок,
ілюзорны ўзвышэння рог
твой у раструбе ўжо заглох?!.
Я ж прасіў: «Не маўчы!..— як моп—
Не маўчы, каб і я не змоўк!..»

Адступіся!.. Я сам, мой Бог!
Адступіся, мой Бог, я сам!
Я згару ды спаліць не дам!
Буду неслухам, як Адам!..
Адступіся!.. Мой Бог — убок!..

З венаў аспіды смокчуць грог,
з пуні лезуць павук ды цмок,
з гнойнай покуці смоўж ды мыш
загаворваюць: «Цот-няцот...
Выракайся сляпых пяшчот:
летуценнікаў — горлам на плот,
ды ва ўсмешцы парваны рот,
і барвяны са скроняў пот!..
І народ твой — на нуль, на лот!..
І маўчаць краты, як народ!..
Не святар, не анёл, а віж
правярае магільняў ціш.
Людзі — людзі, звяры — звяры.
Марай хочаш прыйсці? — гары!..»

Я гару на скрыжалях мар —
марна верац, што я ўваскрэс!..
Я палаю душою спрэс,
я гару на крыжоўі крэс,
я гляджу на нябёс парэз,

а з парэзу «Куды ж ты ўзлез?!.»
Адзічэлы і хворы, у лес
прыбягу пахаваць свой дар,
што ўпусціў на зямлю Ўладар.

«Ты няздар, ты няздар, ты няздар...
з дрэваў белыя крумкачы.
«Тут капцы!.. Не тапчы, не тапчы...»
з плітаў белыя крумкачы.
«Ты зважай, ты пільнуй, ты сачы...»
з хмараў белыю крумкачы.
«Праз цябе прараслі касачы...»—
ў спіну белыя крумкачы.
«Прошчай цела сваё змачы...»—
з ветру белыя крумкачы.
«Забяры!.. Ты павінен змагчы!..»-
з промняў белыя крумкачы.

«Не пярэч!.. Памаўчы, памаўчы!..»—
вязні — белыя крумкачы...

«За табою жыве чарга,
кожны першы ў чарзе той гад—
зганьбаваць, напаскудзіць рад».
Кажа гад: «Я твой брат. Тв.ой брат!»
А з-за слоў перагар і мат.
На Дзяды,
на жніво,
ў час Каляд
свалата ідзе на агляд—
кожны першы лісліві гад
патыхае: «Твой брат я, брат!..»
І паўзуць гады ў лес, бы ў сад,
кожны першы паўзун з іх кат—
скрасці дар хоць праз смерць ён ра
Кажа кат: «Я твой брат, твой брат!.

«Забяры!.. Ты павінен змагчы!..»—
твары — белыя крумкачы...

...Знітавалася птаства ў шар—
крумкачыны дзюбаты твар,
і асмягнуў няўпэўнасці жах
на рудых ад крыві крыжах.

Дыхла сціснула... Заняло.
Як сівой навальніцы крыло
па вачох асляпелых прайшло!..
Я жыло... я крычала... жыло!..
Крумкачыная плойма жытлом...
Птахаў збеленых крылалом...
Да нябёс — галавы на злом!..

...Ды зляцеў крылатвары шар
без мяне
і пакінуў дар:
«Забяры яго, забяры!..
Мы табе не браты — сябры.
І не грэбуй ты дарам век,
бо не птах ты, а чалавек...»

«Забяры!.. Ты павінен змагчы!..»—
дупіы — белыя крумкачы...

Я зірнуў на свой дар — немаўля...
Гэта ж я?!. Немаўлём быў я!..
Немаўлём на грудзях зямлі—
мяне птахі з сабой не ўзялі!..

Знайдам я на няспынку дарог
лашчу след твой, пільную крок...
Звандраваўшы на мой парог,
папярэдзіць забыўся знарок,
што ты ў веку маім, мой Бог,
што таксама дзіцём ля ног,
немаўлём на грудзях нябёс.

Крыж — не крыж твой,
а лёс — не лёс...
Мовіў юны Бог: «Ты сурмач,
голас свой сам усім тлумач!..
Хваля ты, а сусвет — прыймач!..
Ты гулец,
тут гульня,
твой матч!..»

Я хацеў... я ляцеў...
«Вар'яцеў!..
Час прыйшоў — ты цяпер саспеў!..»

І гучыць небяспечны спеў:

«Адхіснуся
я
ад маны!..
Дацягнуся
я —
дзе званы!..»

...І на гукі сівой сурмы,
як аблокі, бягуць сланы—
круглабокія, бы збаны,
ружавокія ўсе яны,
як з дзіцячых малюнкаў сны...

Я гару за цябе, мой Бог.
Я змагу, калі ты не змог.

* * *

Нашто дазволіў прыйсці сюды —
тут толькі слёзы, слёзы, слёзы...
Я веру, забярэш тады,
калі залозы сточаць лёзы,
калі рачулка ўкленчыць піць,
і акіян у ёй засмягне,
і дух праскону будзе віць
туманам
і аблокі сцягне
з блакіту, каб чысцейшым быць.
Я памятаю — быў я мніхам,
і валацугам быў і вокам
трохкутным,
быў калісьці ўздыхам
найпершым
і апошнім Богам...
...Быў енкам, хрыпам, крыкам, рыкам...
«У час, вядзьмак, у час, расстрыга!»
Крок у прастору крок з планеты,
крок у касмічнасць... Шал уздыху
млынарыць вадаспады Леты,
узбуджанай адзінай крыгай,
што з крылаходу Іпакрэны
на Лету пляц свой нахіліла...
Ўлілася Іпакрэна ў вены,
і надалася Леце сіла.
І спавядала рэчка рэчку,
вада — ваду, а хваля — хвалю...
*2002*

***Замова ад Злыдухаў***

Сыдзі, сыдзі, Злыдух, з камянёў
сыдзі, сыдзі з рамёнаў і клецяў!
І мы а трэцяй дзядоў памянём,
і а чацвертай — бацькоў прывецім,
а ўжо а пятай — дзяцей асвенцім,
як хлеб і лёс,
як Хрыстос з нябёс.

Мы маем мову сваіх дзядоў
і ёю мовім да вас, Злыдухі:
сваіх імёнаў, капцоў гадоў
мы не дамо вам,
мы — Белаўнукі!

Мы не аслепім сваіх вачніц,
мы беладушаў сваіх не знішчым,
мы заклінайма паўзці вас ніц
лёсткай вужакай па папялішчы!

Мы — Белаўнукі!
Для боства ў нас
ёсць боль і горыч — мы гэтым жывы!
А што, Злыдухі, да вас — то ў вас
няма нічога без боскай сілы!
Вы толькі здатны цягнуці жылы...
Без боскай сілы...
Без боскай сілы няма нічога!—
вы ля парога

пёркі на крылы
цягнулі ў Бога...

Сыдзі, сыдзі, Злыдух, з камянёў,
сыдзі, сыдзі з рамёнаў і клецяў!
І мы а трэцяй дзядоў памянём,
і а чацвертай — бацькоў прывецім,
а ўжо а пятай — дзяцен асвецім
зіхотным днём.

А вы ўсе прэч, прэч адсюль, Злыдухі,
вас заклінайма мы, Белаўнукі!
Сыдзі, сыдзі, Злыдух, з камянёў
і мы ў спакоі дзядоў памянём.
Сыдзі!
Сытдзі!
Сыдзі!

*2003 (а 3-й гадзіне ночы*
*апасля Радаўніцы)*

* * *

Расплюшчы хутчэй вачаняты:
мы — сабачаняты,
храмабарвы — на вершапакосах.
Рэжуць варвары юныя косы,
а сівыя косы — на лірах
рвуцца самі спастылаю ношай,
непрыгожаю і маўклівай,
на крыжы маленства апошленай.
І магута і бель зацкаваныя,
і камень і крыніца асвенчаны
ці Чарнобылем ці Асвенцімам
і пытаннем — каго назваць мамаю?
Ці ваўчыцаю? Ці памежніцай?..
Над узмежкам жыцця пацешыцца?..

Як няма чаго ўзяць — дык дзецьмі
забярыце апошнюю плату.
Не хачу жыць і дыхаць ледзьве,
як на шыбеніцы перад катам.
Лепш ахвяраю, чым злачынцам,
з крыжам лепш, чым крыжапраклятцам!
Нам яшчэ так доўга вучыцца,
нам яшчэ так доўга баяцца...

І прыкметаю смерці голас
загучыць. І ты ўздымеш голаў
і адчуеш, які ты голы,
калі Богам адкажа колас:

«Вы расплюшчыце вачаняты -
не мае вы зярняты, не.
Вы зусім не мае зярняты,
вы — звычайныя са-ба-ча-ня-ты,
толькі ўмееце лётаць у сне...»

*2002*

***Каб неба сагрэць...***

Дзяцінства і смерць —
ружовы і белы...
Праскрозненасць мецць
на правы і левы...

Ісці па вадзе
да крылаў
і храмы,
як крыжам, прадзець
узгадкай слоў мамы.
«Каб неба сагрэць...» —
яна гаварыла.
«Каб неба сагрэць...»,
у печцы паліла
старыя анучы
і думкі-нягожы.
«Дачушка і ўнучак
жылі каб прыгожа...»

Каб неба сагрэць—
маліцца нам трэба,
узняцца хоць ледзь
і ўвечніцца ў неба.

Каб неба сагрэць...

*2002*

* * *

Давай пашкадуемся,
давай папяшчоцімся,
у знічкі знітуемся,
у мамы адпросімся.
Даваймa сустрэнемся,
давайма абдымемся.
Давай, не старэючы,
ў нябёсы мы ўздымемся!
Давайма адмовімся
ад свету ад гідкага,
давайма дамовімся
ад часу ад плыткага
ўцячы...

*2003*

* * *

*А. Г.*

Плечы ўгарбелі без крылаў...
*З ранніх вершаў*

Павянчаны з каплічнай цішай,
ты — паломнік гатычных слёз,
патаемны стод юных мнішак
з каляровых крыштальных кроз.

Ты — бліжэйшы за адзіноту,
за спаткальны палон — далей...
У сляпога крыла палёту
ўсё адно белата лілей!..

Ява тчэ, як мядота — соты,
панядзелкавы шары тлум.
Адрачыся ў імя пяшчоты
ад будзённасці ў вербны сум!..

Паглядзі, як мякчэе свечка,
набрынялая цеплынёй.
Старажытнай катрынцы вечнасць
выпадае, відаць, адной...

*2003*

* * * **(Эрас паэтаў)**

Мне сніцца Дыянісава цяпло —
пяшчотадакраналььную катрэны
і стомленасць вакхічная Верлена
над росным целам юнага Рэмбо.
Нібы Эрот дзіцячых сноў — П'еро,
паэт-падлетак — вучань у пасцелі.
Ды фарбаю мякчэйшае пастэлі
майстэрска словы лягуць на пяро...
...а з крылаў — на паперу — апякуць!..
...як семем! — цішыню гук абцяжарыў!..
...і жарсцямі аплодненых пажараў
цалункаў крозы свежыя саткуць!
«Давай жа, Поль!.. На вуснах нашых соль!..
Для юру мне патрэбны сто Верленаў!..
Для вершаў — дзесяць тысяч Мельпаменаў!..»
Экстазны, дзёрзкі ўскрык: «Давай жа, Поль!..»
«Душа, Арцюр,— абсентавы накцюрн!..
О, ўсіх містэрый лозы ў вашым целе!..
Я так хачу, каб вы мяне хацелі,
як я хачу вас... Любы мой, Арцюр!..
Мне ваша дакрананне, як татэм,—
таўро аховы ў шэпце гасканадным.
Знясілены, я ценем каланадным
над вашым ценем выспелю: «Те і'аіте...»
Мне сніцца Дыюнісава цяпло
ў мілосным меласе, у чуйным спасціжэнні,
у плоці і паэзіі сцяжэнні...
Цудоўна-жорсткае юначае цяпло...
*2003*

* * *

Мне пякло сядло, мне пякло,
пада мной жарабец скакаў,
быў пазначаны грэцкім таўром,
поўны жарсці, яго запал.
*Замест эпіграфа*

Апякуйся, Вялес, аслані
не выгнанне сваё з Пантэону,
а трызненне маё — барані,
як Барысавы камяні,
вырачэнне:
«Каханне да скону...
...не прымаю — баюся прыняць,
бо занадта, замоцна кахаю.
Я — няздар, я не здолею ўзняць
на вышыні, з якіх узлятаю,
кожны ўздых, што з табой памятаю...»

Смык ідзе па вадзе ў чарадзе
белых лебедзяў хвалі руйнуе -
вагкаватасць ірве чарадзей,
ён, марнуючы радасць, балюе.

Ў хвалях пенных стаіць жарабец,
хвалі словам мустанга туруюць.
«Dolce, dolce...» — туруе й галец —
хваляў збеленых верны ганец.

Тут вызвольныя стогны палююць

на ружовыя россыпы зор,
на пясчаныя насыпы ветру,
на шыкоўны разораў узор,
і трымаюць-нясуць свой дазор,
і віжуюць маленькую Герду.

«Дзе мой братка, мой братка дзе?» —
я, з ільдзінкамі ў горле, завею
запытаюся і захварэю.
«Дзе мой братка, мой братка дзе?» —
я азёрную краску лілею
ачмурэла ўдыхну й захмялею.
«Дзе мой братка, мой братка Кай?
Адкажы мне, нямотная постаць!
Я не здолею ўзяцці пострыг —
цацкі-шыбенікі вострацць
лёзы-дзіды ў мой небакрай...»

«Сціхні, сціхні... — шапоча гай.—
Ты, не зведаўшы расчаравання,
хочаш у наркатычным тумане
з братам, з цацкамі жыць — не далей?,
І сцішаць, і заглушваць дазвання
слёзны водар дарослых лілей?!.»

«Я не здо...»
«Ты не здолееш болей
жыць чужою сям'ёю і воляй!»
«Тата, мама...»
«Ты ўжо не дзіця!
Ты шукаеш, глядзі, адкрыцця»,—
гай знямеў.
І кентаўр прамовіў:
«Пры ніякай іншай умове
я не стану тваім, ты — маёй.
Застануся адзін, ты — адной.
На выгнанні мы будзем сам-насам
і не спраўдзімся так раз за разам
у дурное дзіцячай самоце,
у тваёй і маёй адзіноце».

«Я каха...»
«Ты не здо... ты не здо...
Ты ратуеш чужое гняздо.
Досыць мо?
Досыць мо?
Досыць мо?
Можа, час?!
Ужо час даўно!»
«Так, я здо... Я каха...
Но!.. Но!»

P. S.
Мне пякло сядло, мне пякло...
Пада мной жарабец скакаў
быў пазначаны грэцкім таўром,
поўны жарсці, яго запал.

Расчашу жарабца грэбнем я,
валасы нацягну на смыкі:

адзін чорны, другі — такі
ён сівы, але грае як!
«Dolce, dolce...» — ядвабны акорд.
«Presto, presto...» — блазнуе струна.
«Dolce, dolce...» — пяшчоты код.
«Presto, presto...» — ажно давідна.
*2003*

* * *

Ой, сівы конь бяжыць - на ім бела грыва...
Ой, спанаравілась, ой, спанаравілась
мне тая дзеўчына...

*З беларускай народнай песні*

«Харошы мой...» -
прамоўлю мройна, ціха,
крыху збянтэжана...
Устанеш спакваля,
абдымеш
і з усмешкай д'ябла-мніха
прамовіш ты: «Харошая мая...»

І асмялеўшы,
я праверу «Мілы...
навек ты малады, а я - твая!..»
Ты пажартуеш:
«Паглядзі, я сівы,
як конь з той песні, мілая мая».

Павесялеўшы,
я паверу «Любы,—
як добра! —
заручыла нас зямля!..» .
Мае ў краёчак пацалуеш губы,
пасля — у вусце.
«Любая мая...»

«Каханы мой...» — палёт самотнай кані.
«Ці ведаеш ты, што ў мяне сям'я?..»

«Сям'я?.. І я пакуль жыву з бацькамі...»
«Бог з ёй!.. Грашым, каханая мая!..»
Аксюмаран кахання на змярканні —
юначы спеў сівога салаўя...

*2003*

* * *

У чароўнай краіне мрояў,
у цудоўнай краіне мараў
заблукалі мае героі,
заблукалі мае харалы.

Дакрануўся да зоркі ветах
і заззяў шчэ ярчэй, а вецер
удыхнуў дух і веліч лета
ў маладое зялёнавецце.

Усміхнулася зорцы рэчка
крышталёвай сваёй усмешкай
і спазнала сінечу ўрэшце,
паяднаўшыся з млечнай сцежкай.

Сівізна пракаветнай белі
туманамі зляцела долу—
пухам пёраў снягі аселі
ў спёку сонную без дазволу,

захінуліся ў срэбны вэлюм
твар і косы паломнай ночы.
Месяцовай поўні арэлі,
рассякаючы сум прарочы,

ззіхацелі блакітным лёдам
(а ліхтарні значнелых вуліц,
як маленькія поўні з мёдам,

люстраванні вялікай туляць).

У чароўнай краіне мрояў,
у цудоўнай краіне мараў
пасівелі мае героі,
пасівелі мае раманы,

дзе сагрэта ў далонях неба,
высპяваюць, як смоквы, сонцы,
дзе капцамі мудрэе глеба,
выпраўляючы ў шлях бясконцы;

дзе апальваюць чалавека,
як гладыш з мяккацелай гліны,
і збіраюць аскепкі ў рэха,
акрапляючы боскай слінай;

дзе не зведалі птахі вырай,
не сплылі рыбы ў чужарэкі,
пчолы не прыхавалі вырак
вырачэння на вулляў стрэхі...

У чароўнай краіне мрояў...
У цудоўнай краіне мараў...

*2003*

* * *
Спавітыя ў травы целы
мкнуцца пад адхон
дарогамі ценяў.
Ацяжэлыя павекі —
на кожнае па веку —
цэляцца зрэнкамі
у шнараваны
ацалелы скон.
Аксамітны барытон
тонікамі
мінорыцца,
цацкаецца з памфлетамі.
Флейтамі іх,
флейтамі!
Лірамі іх,
лірамі!
Міфамі іх,
міфамі!..

Праспявай, Эрата,
антычнасць!..—
лера на гарышчы
дагарае...
Ларошфуко,
Эдгар По,
Дарыо Фо,
куды вам да
Сапфо?..
*2002*

***Вершасутык***

У цішыню бя***гу***
***гу***кам
з розных бакоў
лёснага шля***ху***.
***Ху***каю на вастрыню.
***Ню***хаю
лёду
абвостраную сма***гу***
***Гу***мнамі ры***каю.***
***Каю***ся
сенам і травою
вагкава***таю***.
***Таю*** ў даляглядзе...
***Дзе*** мне да нябё***саў!..***
***Саў***ю гняз***до*** —
***до***сыць іпушанят
выкі***дваць —***
***даваць*** зязюлям
лёгкія
ляманта***выя***.
***Выя***вы з абра***зоў***
***зор***аццa між дрэў
чужын***скіх***.
***Скі***нуцца б до***лу***
***лу***гамі і жыцця***мі***...
***Мі***ласці і мілос***ці***
***ці***каваць даводзіц***ца***...
***Ца***рыцца астральнасць ду***ху***.
***Ху***тчэй на да***хі*** —
***хі***бы выпра***віць*** —
***віць*** гняздо!..
***До***!
До... До. ***До!..***
***До***сыць птушанят
выкідваць...
*2002*

* * *

Калі замерзнуць — ад каляднай сцюжы!
Калі натхнёным быць — сваёй зямлёй!
Калі кахаць — наросхрыст, да парожняй,
да дна, да шчасця быць заўжды з табой,
мая зямля, мой вырай вечны!..
Я адлятаю да цябе ізноў.
У снах, Славяншчына мая, гарыш сланечнікам,
аскепкам сонца, глыбінёю зор!..
Калі паверыць — то купальскай ночы!
Калі ўваскрэснуць — побач з Ім, з Хрыстом,
і шлях абраць самотны і прарочы,
жагнуцца тройчы — выпусціць боль-стогн —
ў нябёсах Дух малітваю натоліць,
як каласы спатольваюць свой сум;
і права Духа гэтага адстойваць
ў бяздушшы і ў выгнанні спраў і дум.
*2002*

* * *

Жанчына, цяжарная сынам,—
Жанчына, цяжарная Богам.
Не
чапайце
Жанчыну,
якая носіць малога!
Чэрава маці — заслона,
ахова дзіцяці святога.
Айчына, цяжарная сынам,—
Айчына, цяжарная родам.
Не
чапайце
Айчыну,
якая носіць народы!
Зямліца, цяжарная сынам,—
Зямліца, цяжарная воем.
Не
чапайце
Зямліцу
якая выношвае волю!
Сцябліна, цяжарная сынам,-
Сцябліна, цяжарная плёнам.
Не
чапайце
Сцябліну
якая носіць імёны!
Ралліна, цяжарная сынам,—
Ралліна, цяжарная лёнам.
Не
чапайце
Ралліну,
што носіць урод зялёны!
Сцяжына, цяжарная сынам,
Сцяжына для пакаленняў.
Не
чапайце
Сцяжыну,
якая носіць каменне!
*2002*

***Здоля згубы***

Па аблоках бягу без адзення і босы,
а за мной уздымаюцца крылы-нябёсы...
*З ранніх вершаў*

Я аднойчы стаяў на даху
аб суцешнае трызніў смерці,
і я прагнуў яе, як дзеці,
для бацькоўска-сяброўскага страху
і любові, уздадзенай з гакам.
Я хацеў каб на белым дасвецці
апраўдалі маё адлецце,
каб адным-адзінюткім махам...
Каб па мне галасілі сілы,
каб мяне абдымала мама,
каб мяне не пускала брама
залатая, дзе Божа мілы,
калі цела адчуе паветра,
калі свечкі запаляць каштаны
у аздобе нябеснае манны,
калі ветах прастудзіцца ветрам,
калі вежы апусцяць голаў
калі юды юдолі ўкленчаць,
калі іх, як прасвіры, асвенчаць;
і скрыпач заіграе сола,
і струна затрыёліць: «Досыць!..»,
і паўстане лугамі ганьба,
калі будзе ўздадзена даньба,—
па вадзе Езус прыйдзе босы;
калі смык парве каляіны,
калі колы зацягнуць аблокі
і плугі пазнаюць аблогі,
а зняважнікі — вырай асіны;
і застогнуць сумоўныя сосны,
і з'ядднаецца дождж у грымоты,
каб самотай апошняй ноты
акрапіць небаболь мой росны.

Як агмень, запякуць папругі,
напаўзуць на ногі, на рукі
гнаявыя князёўны — мухі,
калі схочаш змяніць свае рухі,
калі схочаш парваці з хеўрай,
што ахвярнасць прарокаў пляжыць
на дняпроўскім і нёманскім пляжы
мо саўюцца ў спружыны нервы,
не ўгняздуюцца ў словах думкі?..
Заручоны з пустэльнай цішай,
не прамоўлю ні клятвы лішняй:
гукі — як маўчання рабункі,
цішыня - як спынак у вершах,
цішыня — *амінь* між малітваў
і магута Віленскіх Літваў
а сцішэласць — юдоль няпершых.

Неба глуха губляе зоркі,
не паспеўшы ўзгадаць жаданне,
і гавее саспелае ранне
спачуваннем за лёс іх горкі.
Галізною чарнеюць клёны,
прыспусціўшы цені з галінаў—

ну з якіх галівудскіх кінаў
мы ўсе ўбачым на дрэвах імёны?..
Ці мы ўгледзімся ў твары-дрэвы,
ці спазнаем, што дыхаць трэба,
ачышчаючы бездань неба,
спавядаючы плач залевы,
памятаючы толькі сэрца,
ўзгадаванае едным сумам,—
каб не сплавіцца ў шарасць тлумам
і сцяжынаю, што парвецца,
не прадоужыць свае зародкі,
калі нават удар з-за спіны
і паўсюдныя здзекі-кпіны?!.
Мы ж таксама чыесьці продкі!..
...Я аднойчы стаяў на даху
трызніў пра немінучасць смерці
й палюбіў я жыццё, як дзеці...
*2002*

* * *
Лістком на стаптаны мурог,
золкам праз небасхіл
апошні раблю я крок.
Нікчэмнасць... За што любіў?.
Божа, за што пакараў
Ты сваё «Я» ў грамадзе?..
Божа, за што Ты аддаў
свету мане, барацьбе?..

* * *
Рыжым купалам трываліцца зара,
туманы ўліваюцца ў разоры,
хустку досвітку накідвае гара,
маналог апошні шэпчуць зоры.
Напаўзае цёплы ранак на крыжы.
У траве з дрыготкаю расою
ловіць лугавыя міражы
светлы хлопчык бацькавай касою.
*2001*

* * *
Прыпыніце ходу крыгаходу!
Пагляджу я між крыг у ваду.
Апантаны зямною свабодай,
па вадзе да Ісуса прыйду.
Напішу запавет я свой новы
запаветам мне стане верш.
З далягляду я вызвалю словы:
Бог жыве, покуль Ты жывеш!.
*2001*

* * *

Я магу
чакаць без сканцэння
покуль знікнуць
словы і ноты.
Абмяжоўве
летазлічэнне
маладосць
маёй адзіноты

*2001*

* * *

*А Г.*

Як па-дзіцячы: «Я кахаю!..»
Як па-старэчы: «Не магу...»!

*З ранніх вершаў*

Смягне душа па восені
і па зжаўцелым лісці,
сочыць за рухам просіні
на небасхоўным выйсці.

Слёзы-мужчыны шчырыя,
слёзы-мужчыны ўпотай.
Слёзы-жанчыны ў вырai,
слёзы-жанчыны потым.

Казкаю казка жывіцца,
дбае аб веры сповед.
Бездапаможна сіліцца —
правіць працяг аповед...

Лірнік змаўкае спевамі,
струны на ліры сівеюць..
І пад аблокамі шэрымі
зманы зямныя грэюць...

*2003*

* * *

*А. С.*

Мой бацька,
мой браце,
мой стомлены талентам хлопчык,
наіўны і шчыры
да самых сівых валасоў.
Пан Лёс варожыцы
«Уздыміся,
ачуйся, малойчык!
Бразготкай сваёй
разбудзі,
разбурлі
вершасон».

*

А мо насамрэч адзіны
ў краіне маёй прарок
і той сканаў ад Радзімы,
забыўся на свой парог.

Напэўна, забыліся людзі
на мову прарока свайго.
Без мовы прарока не будзе!
Без словаў патухне святло...

Ён п'е за яе, Айчыну
як п'е за сябе віно.
І варты Радзімы, магчыма,
адзін ён — усё адно.

І топіць свой боль без спачыну
ў самоце, у варажбе,
з нейкай прарочай прычыны,
як п'е за Яе — за сябе.
*2000*

* * *

Я хачу каб Максім уваскрос,
каб прайшоў па травіцы роснай,
каб валошкай ручнік прарос,
калі зорны гукае россып.

Прагну ўбачыць, як вучыць сына,
з ім гуляючы ў светлых гаях,
скажа: «Сынку твая Радзіма —
шматпакутная гэта зямля».

У расстанні зірне на Венеру—
юнай зоркай уздымецца ўслед.
А зямлю маладою верай
ён надзеліць, пакінуўшы след.

Хай па гонях нясуцца коні...
Страцім-лебедзь — як здань вышыні.
Багдановіч — вершнік Пагоні —
мы нашчадкаў тваіх абаронім,
бо нашчадкі твае — гэта мы.
*2001*

* * *

*Наследаванне С. С.-В.*

Сабяру мой народ я па частках—
Па фрагментах сафійскай фрэскі!..

*З ранніх вершаў*

Лячу. Хачу вышэй, вышэй яшчэ!
Загад: «Уніз!» Ляжу знямела.
Не стала ад нябёсаў мне лягчэй,
гавее зганьбленая вера.

Не суд прысуд людзям нясе,
а нелюдзь-паняверца.
Цячэ са скроняў веліч пакрысе.
Харугвай над народам рвецца сэрца.

І песня парываецца — ў адчай,
а я, сляпы, хачу намацаць
адвагу — не пакору — у вачах,
з багніны ўзняцца я хачу ў семнаццаць.

Нікчэмнік мне крычыць: «На дол! Маўчаць!»,
і я маўчу на роднай мове.
З апошняй моцы буду паўтараць:
«У брудзе твар, ды я над вамі ў Слове!»
*2001*

* * *

Бойка крыжамі вечнасці
будзе ў бялюткім садзе.
Стане душою літасці
вера, якую мы скрадзем,
сцягнем, зачынім у сэрцы,
бо даражэй нам за долю
думка, якая імкнецца,
прагне пяшчоты і волі.
*1998*

* * *

Лямантуй, Вельзевул, лямантуй,
бо касар мацыёлу катуе!..
Уратуй з-пад ляза, уратуй
леўканічнасць усходнюю тую!..

Адкажы, Вельзевул, адкажы,
як лягчэй — на крыжы ці пад крыжам,
на жэньпэневым жыльным нажы
ці пад панствам гарчычнага віжа?..

Будзь са мной, Вельзевул, будзь са мной,
покуль сем жэрміналяў надыдзе,
і на вочы кіянаў як Ной,
не пускай ні на дзень, ні на тыдзень!..

Узрасці, Вельзевул, узрасці
не аліву — алісум жаўцюткі!..
І дазволь басаног прайсці
па вачніцы патопу паўнюткай...

Затрыёль, Вельзевул, затрыёль,
роўны д'яблу, на пекнай віёле,
каб мінор скавытаў быццам боль,
знемагаючы як ніколі!..

Не засні, Вельзевул, не засні,
каранкуючы хвалі ў адлігах,
і чуйнуй, і сачы дзень пры дні,
як жагнаюцца душы на крыгах!..
*2002*

## *Рэанімацыя*

На медычных сталах раскрыжаваныя,
адбітыя ў люстраных столях,
лятаюць у пакоях шпіталя,
незаўважныя для наваколля,
акрыленыя адсутнасцю цела,
звар'яцелыя ад асалоды,
душы дзівакоў-філосафаў.

Нерухома глядзяць істоты
на досвітку ў ложках габляваных —
па-гаспадарску складзеныя рукі,
прыгожыя стомленыя твары
ад чаканай спатольнай разлукі.
*2001*

### *словы пунсовай мовы*

коцяцца коцяцца словы
на словы ідуць ловы
ловы — галосяць удовы
ва ўдоў не стае мовы
мовы захад пунсовы
пунсовы — драпежныя совы
совы ў крыві пунсовай
пунсовы камень новы
новы прамовіць умовы
умовы замеет мовы
мовы маёй паловы
паловы — на прошчы змовы
змовы натхняюць галовы
галовы лятуць на дровы
на дровах — чорнаю бровы
бровы сівой каровы
каровы рыкаюць замовы
замовы рыкаюць каровы
на словы ідуць ловы
коцяцца коцяцца словы
*2002*

### *Змова тугі*

Здзічэла мая туга...
Ёй прыкра, не ў змогу болей
спатольвацца на адзіноце,
не давяраць пяшчоце,
і жалем выспельвацца, болем,
і патураці няволі,
і ад яе люцець,
і ценем нямым вар'яцець,
і крыўды чакаць,
і юдолі шукаць...

Здзічэла мая туга...
І зруйнавала міфы,
і зружавела фарбы,
і раскапала скарбы
заклятыю,
як Эмілія Плятэр
у празе знайсці клады
памяці і жуды,
што мацавалі ўспаміны,
быццам галінкі алівы.

Здзічэла мая туга...
Я — знайда ў сваім Сусвеце,
маленькім скразным сусвеце,
меншым за кожнае «я»,
што праз мяне жыве.
Я акрыюю ў Леце,

верце мне, птахі, верце,
я ажыву апасля —
покуль шчэ слёз не стае
крылы ўкрыліць свае,
покуль жыццё не дае...

Здзічэла мая туга...
Як Свіслач згубіла вены,
нібыта Няміга — гены,
бы Троя,— спакой,— з-за Алены.
Як мы ўсе ў чаканні змены,
здзічэла мая тута.

Здзічэла б мая туга,
калі б не маё маленства...
*2003*

* * *
Я — колас жытнёвы ў полі,
Я — птушка ў высокім палёце,
Я — кропля расы на ніве,
Я — чаша паветра без донца,
Я — сонечны промень у горы,
Я — той дзень апошні,
што так неабходны
табе.
Я — тое,
чаго не стае.
*1996*

***Вышыня***

Пралячу над полем,
лесам і лугамі,
сінявокай рэчкай,
шэрымі гарамі.
У паветры чыстым
шчасце я адчую,
вышыні празрыстай
я жыццё пачую.
А палёт птушыны —
быццам чалавечы.
І сляза дзіцяці,
як жыццё,— навечна.
*1996*

* * *

Не толькі ў час журботы смутнай,
але і ў дзіўнае імгненне
ты ў сэрцы памяці пакінь
крыху свядомасці і мары.
Жыццё не будзе аднастайным,
бы шкло заоытага акенца,
бы ліст, які ляжыць у шафе,
пакрыты пылам, як і сэрца...
Зрабі жыццё квітучай ружай,
зрабі яго слязою шчасця,
агнём, палаючым вясною
у сэрцах юных закаханых,
і муравой зрабі з расою,
якая ззяе на ўзыходзе.
Зрабі такім, як хочаш ты,
а не такім, як хоча хтосьці.
*1998*

## АДСУТНАСЦЬ ЦЕЛА

* * *

Маю мажлівасць
не захлынуцца ў натоўпе.
Маю сілы
не стаць натоўпам.
Выпраўлю хібы гравітацыі —
уздымуся над...
*2001*

* * *

Здранцвеюць вусны
буду вачыма
гаварыць.
Выкажу вочы —
буду рўкамі
глядзець.
Прагледжу рукі —
буду сэрцам
вітацца.
Развітаю сэрца -
буду душою
біцца.
Разаб'ю душу —
буду...
Проста Буду.
*2001*

* * *

Са стагоддзя ў стагоддзе
змяняюць правілы,
з году ў год
паляпшаюць законы,
з дня ў дзень
усталёўваюць парадкі —
з часоў Стварэння Свету
заганяюць прастору ў рамкі
Утапічнае наваторства!
Калі Я — мяжа,
Я — ваша
памылка.
Выпраўце правапіс!
*2001*

* * *

Ці быў ты немаўлём?
Дзе тваё маленства?
Буду, буду!
Яно прыйдзе, прыйдзе!
Не веру сваім абяцанням —
Нарадзіўся хрышчоным.
І нясу тры крыжы:
асінавы — на шыі,
зямны — на плячах,
нябесны — у сэрцы.
*2001*

* * *

У чыёй буслянцы буслы?
У маёй — вецер.
У чыёй калысцы дзіця?
У маёй — бразготка.

У чыёй печцы агонь?
У маёй — вуголле.
На чыім стале хлеб?
На маім — каменне.

У чыёй рэчцы вада?
У маёй — бруд.
На чыім полі калоссе?
На маім — галасы
галосяць:
адбудуйце гнёзды для буслоў
адпіукайце ласку для дзяцей,
прынясіце крэсіва для агню,
ачысціце плёс для вады.

Нямьгя — нямыя...

На чыім полі калоссе?
На маім — галосяць...
*2001*

* * *

Кожны вечар
малюся,
уздымаючы вочы,
то на абразы,
то на нябёсы.
На каленях...
шырэй далягляд,
далей небакрай,
вышэй небасхіл.
Шукаю адказаў —
прагну пытанняў
у цудатворнай сінечы,
у збавіцельным блакіце.
А знаёмыя сузор'і
жартуюць з пачуццямі,
высвечваюць маё імя —
ВАЛЕРЫЯ...
Неба таксама цікавіцца:
хто я?
*2001*

* * *

Напружана
ўглядаюся ў люстэрка:
хачу ўбачыць
сваю сутнасць-душу.
А па-за люстэркам
б'ецца аб шкло
мая душа —
імкнецца ўбачыць мяне.
*2000*

* * *

Сказалі:
«Ты — сукве цце
маладой прыгожай кветкі».
Мне падалося:
«Я — парастак
ад крывога старога карэння
*2000*

* * *

іду
Са мною чатыры цені —
Сучаснасць, Магчымасць,
Забытасць, Істотнасць.
Першы — поруч —
                    крок у крок з гаспадаром,
другі — наперадзе —
                    падбягае, спяшаючыся,
трэці — ззаду —
                    знясілены валачэцца,
чацверты — па шашы —
                    скалечаны коламі.
Я — пасярод —
                    разгублены і незапатрабаваны
Іду.
За мною чатыры цені —
Сучаснасць, Магчымасць,
Забытасць, Істотнасць.
*2000*

* * *

Зімовым вечарам
сяджу і п'ю гарбату,
гарачую салодкую гарбату.
Мой пакой адлюстроўваецца
па другі бок шыбы,
дзе кружыць вецер,
неўтаймаваны халодны вецер.
Такі ж Я-цень
у фальшывым люстэрку —
на іншым баку паралельнага часу
чужой рэальнасці—
сядзіць і п'е гарбату
без смаку і паху.

У задуменні адводжу погляд
ад самога сябе.
Мой цень устае
і выходзіць за дзверы,
таксама забыўшыся
на мяне.
*2000*

* * *

Малюся на абраз у куце пакоя —
сповед лунае ў нябёсах.
Удыхаю аблокі гару і пылу —
дыхаю іншым слоем атмасферы.
З паштоўкай зямному сябру шлю прывітанне -
кожны дзень пішу лісты на адрас Сусвету.
Я жыву ў двух вымярэннях
на мяжы зямной абалонкі,
што адлюстроўвае Планету і Бязмежжа.
Не магу ўсвядоміць:
па які бок Планета...
па які бок Бязмежжа...
*2001*

* * *

Калі аранжавая чайка
кружыць над ярка-чырвоным акіянам
з бэзавымі крыстамі хваляў,
калі птушка мае чатыры крылы
і не мае вачэй,
калі праз ваду
відаць ядро планеты і магма,
што пульсуе і абвівае
падводныя
гарача-барвовыя
і лядова-сінія рыфы,
утвараючы рознакаляровыя крыжы,
а белы-белы да знікнення,
я не адчуваю цела —
бачу толькі адлюстраванні
ў сваіх зрэнках...
Не будзіце мяне —
мой найшчаслівейшы сон...
*2001*

* * *

У садзе выкапаў парастак,
паставіў у шклянку з вадой.
З паперы зрабіў
белую кветачку-арыгамі.

Лілея, народжаная прыродай,
ахінула цудным пахам пакой.

Расклаў лісткі
штучнага двайніка,
напісаў на іх
верш пра каханне —
пачуцце, створанае мной.
*2001*

* * *

Перахрышчу прастору
Дакрануся далонёй да паветра -
- забяру хрышчэнне.
Пакладу крыж на сябе —
мяне перахрысціць прастора.
На скрыгжаванні крыжоў
раскрыжуюць паходняй
і панясуць штандарам
над зямлёю.
Не, не панацэя я,
                                        не сакрамант.
Маю душу напялі
замест харугвы.
Сцягам імкнуся ўгару —
неба чакаю.
Змагары нацкоўваюць вецер.
Вецер у твар —
                                        апраўданне.
Думаюць - я сцяг пера.можны,
а я неба чакаю...
*2001*

* * *

Малюю музыку...
адкінуўшы на падлогу
лісты з нотнымі лінейкамі-радкамі
Пашэнціла ствараць мелодыю
каляровымі фарбамі
але больш чорнай...

Запальваю музыку...
скінуўшы долу
пэндзлі...
Мяккія васковыя свечкі
няроўна гараць
але больш светлым...
але больш чыстым...

Дыхаю музыкай...
забыўшыся на ноты —
маленькія чорныгя плямкі
Прыхільнік нябёсаў і руху
кумір зняволеных
вечны свавольнік вецер
губляе акорды ў небакраі
разгублена свішча-гукае
але больш свежым...
але больш бязмежным...
але больш зорным...
*2001*

* * *

Ажывіць — узяць
частку іншага...
*Замест эпіграфа*

Я ўзрашчу дрэва з болю—
угнаеннем стане планета,
асуджаная мая планета
Настрадамусам й бабкай Вангай.
Карані прарастуць у падмурак —
старажытны разбіты цвінтар,
стромкі гнуткі ствол,
разрываючы тканкі аблокаў
памкнецца ў космас...
Але, зразумеўшы,
што неба — далёка і для дрэва,
нахіліцца пад вагою
сусветных пладоў

Маёй панацэяй
стане яблык.
*2001*

***Дарога***

*Ахвярую загінулым на Нямізе*

Сяджу ў вагоне метро,
які едзе праз час
бясспынку, бясспынку бясспынку...
Завешваю баваўняным швэдарам вокны,
праз якія бачу халодныя рукі,
што намагаюцца ўчапіцца ў мяне.
Праязджаючы загнаную Нямігу
болей не ў стане трымацца за паветра —
усе пасажыры і рэчы знікаюць —
я сам-насам
з настылымі пальцамі.
Не стае моцы...
Заплюшчваю вочы —
праходжу праз сцены
ў трубы скаванай ракі.

Не маё цела
ўспамінае боль.
Не маё сэрца
моліць аб спакоі.
Не мая душа
стогне пра святарні.
Я — рака...
Вакол вільготныя істоты
зліваюцца ў апантаны вір...

Мой дух уздымаецца
над плёсам Нямігі.
Па берагах мае продкі
падаюць на калені,
моляць-просяць аб нечым
на знаёмай мове...
Не магу зразумець —
усё вышэй і вышэй
уздымаюся над вадой,
ператвараючыся ў белую пару.

Пачынаю лічыць услых —
спрабую стварыць час.
Бездапаможна...
Я — воблака...
Не адчуваю сябе —
ува мне толькі памяць.
Я — памяць...
Губляю сябе пакрысе —
хачу вырвацца і аб'яднацца...
з маланкай...
Я - дождж...
Кропля за кропляй
падаю на зямлю,
якая ўсмоктвае мяне.
Я — зямля...
У мяне ўваходзяць
нечыя калючыя абцасы.
Я — след...
На мне ўзрастае парастак,
высмоктваючы маю ўпэўненасць.
Я — кветка...

Я жыву.
Я жыву цэлую гадзіну
кветкай
каля Кафедральнага сабора...
*2001*

* * *

Апранутыя людзі на пляцы:
сябры і ворагі.
Першыя крычалі:
«Ён зняў з сябе шэрасць».
Другія шапталі:
«Шэрасць распранула яго».
Ні ў ворагаў ні ў сяброў
не хапіла духу сказаць,
што Ён голы.
А Ён зірнуў вышэй за плынь.
Хвалі люду...
Дзе бераг?..
*2001*

* * *

Жаўтароцік на дарозе ў холадзе...
Адагрэю,
адпушчу ў неба,
можа, калі ўбачу магутным птахам?..

Праз гады на дарозе той жа жаўтароцік...
Адагрэю:
няхай жыве...
*2001*

* * *

Званар бачыў неба —
пераліваліся літургічным напевам званіцы
Скрыпач чуў людзей —
захлыналася рэквіемам скрыпка
Сляпы жабрак
глуха стагнаў пра сыноў

Пілігрым дайшоў да далягляду
Звон трэснуў...
Струны парваліся...
*2001*

* * *

Дзіўная незабудка
прывабіла рамантыка.
Ён зрабіў крок —
і застаўся з ёю назаўжды.
*1998*

* * *

Навошта з'яўляцца
людзьмі на свет?
Калі можна птушкай...
Калі можна кветкай...

Парушым законы Сусвету —
прыйдзем чыстымі!
Прыйдзем чыстымі?..
*2001*

* * *

Збаны
з рагвалодаўскім роспісам
разбіваюць —
вострыя аскепкі

Ручнікі
з народным узорам
ірвуць —
крывавыя палосы

Манерныя штукары
на сцэне
трызняць
упэўненасцю
*2001*

* * *

Пад гукі афрыканскіх тамтамаў
на гразкай глеістай глебе
пад пякучымі прамянямі Святарнай Зоркі
моляць-шаманяць дзікія людзі
з маністамі на шыях,
дзякуюць...
і прбсяць долі,
як і мы прасілі,
маюць памяць,
як і мы калісьці мелі...
Верацъ у Далёкае Святло,
як нашыя продкі всрылі
ў ласку ўладарнага Ярылы.
*2001*

* * *
Калі кроплі дажджу
перасталі сыпацца на зямлю,
а маланка яшчэ адлюстроўвалася ў розных
баках неба,
па халоднай сцежцы,
што вяла ў знаёмае,
але негасціннае месца,
у цёмную далячынь вольнага ветру
Ішоў чалавек.
Ён быў не адзін.
З ім было жыццё...
*1998*

* * *

Мой храм,
дзе з лыжкаю кагору
прымаюць годнасці гены.
Мой храм,
дзе святароў
дзеці спавядаюць.
Мой храм,
дзе ў чужых тварах
губляеш сябе цалкам
і знаходзіш дарэшты.
Мой храм,
дзе блакіт душу захінае,
калі з нябёсамі раішся.
Мой храм,
дзе шчырасцю і праўдай
ачышчаюцца.
Мой храм,
дзе каханнем вышыням ахвяруюць,
каб німбы захаваць.
Мой храм,
дзе роднасці ворагам
не шкадуюць.
Мой храм,
дзе пацалункі
на крыжы Прадславы
пакідаюць.
Мой храм,
дзе росы дыхаюць

і зоры гавеюць.
Мой Храм...
*2002*

* * *

«Ма!» —
пракрычыпь дзіця.
забыўшыся на яшчэ адно «ма».
«Ма...» —
прастогне салдат,
не паспеўшы дагаварыць апошняе «ма».
«Ма»,—
даскажа за яго першакласнік
першае сваё стова «Радзі...».
«Ма!» —
я паўтару тройчы
за тых, хто не паспеў:
«Ма... Ма...
Ма! Ма!
Мама...»

*Няма, ня-ма... ма, ня-мама... немама...*
*2002*

* * *

Вецер лашчыў
смоль густых валасоў
зеленавокай прыгажуні.
Праз імгненне
з такой жа лёгкасцю
ён бесклапотна гушкаў
вяроўкі шыбеніц
і лётаў
між калючага дроту.
*1999*

* * *

Малеча з вільготнымі вачыма
колеру канцэнтраванага аквамарыну
пазірала долу з нябёсаў.
Бог сказаў:
— Я спапілю цябе на зямлю
камусьці на радасць.
— Не,— прамовіла малеча.—
Я не хачу туды —
я не цярплю вайны...
...І не нарадзілася
яшчэ адно дзіця
з непрадвызначаным лёсам.
...Усё роўна
дадому вяртацца...
...Гісторыя ідзе паступова...
назад...
*2002*

### ***Успамін***

Ля апошняй кветкі лётаў трапяткі матылёк.
Ён нават не спрабаваў сесці на яе:
пэўна, баяўся зламаць кволую сцяблінку.
Раптам неба ўздыхнула — і пайшоў дождж.
Адна буйная кропля збіла знясіленага матылька...

Вольны восеньскі вецер перакочваў лісце,
сярод якога нельга было заўважыць
крылаў маленькага вартаўніка.
*1998*

### ***Напрыканцы***

Прыгажосць.
          Што засталося ад яе?
          Успамін...
Чараўніцтва.
          Што засталося ад яго?
          Позірк...
Прывабнасць.
          Што засталося ад яе?
          Абыякавасць...
Твар зрэзалі
          шнары шалёнага часу.
Квецень вачэй
          змяніла бясколерная ўсвядомленасць.
Святло,
          чысціня
                    і мара
                              зніклі.
Нікчэмная рэальнасць...
*1998*

## ***Потым***

Зямля,
я пакідаю цябе,
я пакідаю сваіх родных і блізкіх...
Але я абавязкова вярнуся да цябе.
Можа, я вярнуся дрэвам,
можа, я вярнуся птушкай,
можа, я вярнуся рэчкай,
а можа, чалавекам...
Але вярнуся.
*1994*

* * *

*Бабулі Валі прысвячаю*

Божа!
Зрабі нас вольнымі,
як птушак,
каб адчуць
вецер цёплы
і мора халоднае,
каб зразумець,
як жыцце
над краем прадоння
вісіць
Божа!
Зрабі нас шчаслівымі,
як малых дзяцей,
каб не ведалі жаху
пакутаў
і злосці.
Божа!
Зрабі нас бязгрэшнымі,
як ты сам.
*1988*

* * *

Шчаслівыя людзі на нашай планеце
дзеці, дзеці, дзеці.
Сумныя людзі на нашай планеце —
дзеці, дзеці, дзеці.
Вясёлыя людзі на нашай планеце —
дзеці, дзеці, дзеці.
Дарослыя людзі на нашай планеце
таксама дзеці.
*1988*

***Кроў Сусвету***

Бачу белае поле —
усё ў чорнай крыві.
Бачу белае поле —
у чырвонай крыві.
Бачу белае поле —
і няма там крыві.
На першым полі
памёр Сатана —
хай не ўстане ніколі,
каменем у сэрца сваё
забярэ ўсе грахі.
На другім полі
памёр Беларус —
можа, ўстане калісьці
Беларус і Радзіма —
ён прамовіць адзіна
і да нас і пра нас.
На трэцім полі
памёр Гасподзь.
І ўваскрос Ён.
І прыйдзе да нас.
*1995*

* * *

Белае поле,
а над ім — белы галуб...
Ідзе па полі белы чалавек,
а за ім слядоў няма.
Я клічу яго:
— Паслухай, чалавеча,
што ж ты такое зрабіў
што за табой слядоў няма?
А ён ідзе, ідзе,
а ў канцы азіраецца,
ідзе да мяне
і кажа:
— Чаго табе, сапраўдны чалавеча?
Я кажу:
— Дык чаго ж за табой слядоў няма?
У яго на вачах
з'явіліся буйныя слёзы.
І адказаў мне ён:
— Вунь бачыш, нада мной
белы галуб ляціць
і ні на крок не адстае —
гэта
ўспамін
майго кахання.
*1993*

## ВЕРШАКОССЕ

* * *

Вагкаваты мурог
падкупляе вока
цяжарнасцю-расой.

*
Пачварныя шнары
на каласах жыта
і сцяблінах лёну.

*
Шчырасцю не гандлююць -
ашчадна выдаюць
па квітках.

*
Магілы даглядаць перасталі,
і ў дрэваў нарэшце
з'явіліся падмуркі — дамавіны.

*
Лушпайкі гісторыі
націраюць мазалі сумленню.
Смецце выкінуць можна.

*

У бяздомнікаў —
і ў людзей, і ў жывёлаў
прадонныя вочы.
*2002*

* * *

Знаходжу зоры ў небе —
спрабую ўбачыць між людзей.

*

Хачу ў свет:
быць святлом
дзеля свету.
Жыццё чакае..

*

Абуджаная крыніца зазвінела.
Абуджанае сэрца зачынілася.
*1999*

*

сповед вяду
праз люстра стагоддзяў
чую: memento mori
ментарскі шлях
змяню на манаскі
*2001*

* * *

Чалавек мае назоў...
Ці мае абавязак
аднакаранёвы
чалавечы:
быць чалавечным?..
Ці гэта
выключна
права нябёсаў?..
Зважай!
Анягож...
*2001*

* * *

Стомлены родны голас
папросіць вады.
Зязюльчына доля:
цярпець смагу.
*2001*

***Хайку***
***Вербнага тыдня***

* * *
Падпальшчык заснуў.
Папялішча чакае,
каб згарэць ізноў.

* * *
Вынайшлі вабік
для людзей — паляўнічы
сезон адкрыты...

* * *
У чужых тварах
губляеш і знаходзіш
сябе пакрысе.

* * *
Паміж альфай і
амегай — амальгама
золата і ртуць.

* * *
Чарнобыльскі дождж.
Духам Марыі Кюры
вярнуўся радый.

* * *
З хаўтураў іду...
Перада мной, як птушка,
здань праляцела.
*2002*

***Хайку***
***Яблычнага Спаса***

* * *
Прасцяг скончыўся,
і няма куды ісці.
Гляджу на зоры.

* * *
Дождж закіпае.
След пільнуе крок. Зямлёй
бот прычмяквае.

* * *
Цвітуць каштаны...
Каля могілак думкі
расцугляліся.

* * *
Сырная поўня.
Сузор'ям у нябёсах
дазвання мігцець...

* * *
Сцюжа, сувоі.
У завірусе жыццё
заблыталася.

* * *
Вецер. З лужыны
бяздомны сабака п'е.
Душы няўтульна.

* * *
Кусты засохлых
парэчак на ферумных
парэнчах вісяць.
*2002*

***Змест***


Чаканая апантанка. *Р. Барадулін*

ПРАСТОРА ГРАДУСА
***Ты такі наіўны, мой Бог...
*** На што дазволіў прыйсці сюды...
Замова ад Злыдухаў
***Расплюшчы хутчэй вачаняты...
Каб неба сагрэць
***Давай пашкадуемся...
***Павянчаны з каплічнай цішай...
***Мне сніцца Дыянісава цяпло...
***Апякуйся, Вялес, аслані...
***«Харошы мой...»
***У чароўнай краіне мрояў...
***Спавітыя ў травы целы...
Вершасутык
***Калі замерзнуць - ад каляднай сцюжы!
***Жанчына, цяжарная сынам...
Здоля згубы
***Лістком на стаптаны мурог.
***Рыжым купалам трываліцца зара
***Прыпыніце хаду крыгаходу!
***Я магу
***Смягне душа па восені
***Мой бацька
***Я хачу, каб Максім уваскрос
***Лячу. Хачу вышэй, вышэй яшчэ!
***Бойка крыжамі вечнасці
***Лямантуй, Вельзевул, лямантуй
Рэанімацыя
словы пунсовай мовы
Змова тугі
***Я — колас жытнёвы ў полі

Вышыня
***Не толькі ў час журботы смутнай


АДСУТНАСЦЬ ЦЕЛА

***Маю мажлівасць...
***Здранцвеюць вусны
***Са стагоддзя ў стагоддзе
***Ці быў ты немаўлём?
***У чыёй буслянцы буслы?
***Кожны вечар
***Напружана
***Сказалі
***Іду.
***Зімовым вечарам
***Малюся на абраз у куце пакоя
***Калі аранжавая чайка
***У садзе выкапаў парастак
***Перахрышчу прастору.
***Малюю музыку.
***Я ўзрашчу дрэва з болю
Дарога
***Апранутыя людзі на пляцы
***Жаўтароцік на дарозе ў холадзе
***Званар бачыў неба
***Дзіўная незабудка
***Навошта з'яўляцца
***Збаны з рагваладаўскім роспісам
***Пад гукі афрыканскіх тамтамаў.
***Калі кроплі дажджу.
***Мой храм
***«Ма!» - пракрычыць дзіця
***Вецер лашчыў.
***Малеча з вільготнымі вачыма
Успамін
Напрыканцы
Потым
***Божа! Зрабі нас вольнымі
***Шчаслівыя людзі на нашай планеце
Кроў Сусвету
***Белае поле


ВЕРШАКОССЕ

***Вагкаваты мурог.
***Знаходжу зоры ў небе
***Сповед вяду.
***Чалавек мае назоў
***Стомлены родны голас
Хайку Вербнага тыдня
Хайку Яблычнага Спаса


Кустава В.

Каб неба сагрэць...: Вершы / Валерыя Кустава; Прадм. Р. Барадуліна — Мн.: Маст. літ., 2004.- 87 с- (Дэбют).

ISBN 985-02-0654-3.


Юная паэтка Валерыя Кустава валодае своеасаблівым светабачаннем, светаразуменнем, светаўспрыманнем. Яе творам уласцівыя філасофская заглыбленасць і ўтрапёная ўзвышанасць, таямнічы эратызм і спавядальная малітоўнасць, апантанасць велічным беларускім Словам і васільковай беларускай вышынёй, захапленне антычным хараством і паганскай п'аэтыкай.


**УДК 821.161.3-1**

© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год